мадзян, а таксама аказваць ім дапамогу пры нешчаслівых выпадках, пажарах і стыхійных бедствах.

Ваеннаслужачым пры нашэнні ваеннай формы адзення забараняецца трымаць рукі ў кішэнях, сядзець або курыць у прысутнасці начальніка (старшага) без яго дазволу, а таксама курыць на хаду і ў месцах, не прызначаных для гэтага.

Цвярозы лад жыцця павінен быць штодзённай нормай паводзін усіх ваеннаслужачых. З'яўленне ваеннаслужачага ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап'янення на службе, а таксама ў грамадскіх месцах у выглядзе, які зневажае чалавечую годнасць і мараль, з'яўляецца праступкам, які прыніжае гонар і годнасць ваеннаслужачага.

1. Назавіце асноўныя правы ваеннаслужачых.
2. Што ўключаюць у сябе правілы воінскай ветлівасці?
3. Як павінны звяртацца ваеннаслужачыя адзін да аднаго?
4. Якія дзеянні ваеннаслужачага пры атрыманні загаду па-за строем?
5. Што неабходна зрабіць пры звароце да камандзіра?

## § 20–21. Воінская дысцыпліна, яе сутнасць і значэнне. Дысцыплінарная адказнасць ваеннаслужачых

*Які агульнавоінскі статут вызначае віды заахвочванняў і спагнанняў для ваеннаслужачых?*

**Воінская дысцыпліна.** **Воінская дысцыпліна** — строгае і дакладнае выкананне ўсімі ваеннаслужачымі парадку і правілаў, устаноўленых у агульнавоінскіх статутах Узброеных Сіл і іншых актах заканадаўства. Яна заснавана на асэнсаванні кожным ваеннаслужачым воінскага абавязку і асабістай адказнасці за абарону Рэспублікі Беларусь.

Змест воінскай дысцыпліны, абавязкі ваеннаслужачых па яе выкананні, віды заахвочванняў і дысцыплінарных спагнанняў, правы камандзіраў па іх прымяненні і накладанні, а таксама правы ваеннаслужачых па абскарджанні незаконных дзеянняў камандзіраў вызначае Дысцыплінарны статут.

Воінская дысцыпліна падтрымліваецца шляхам выхавання ў ваеннаслужачых высокіх маральна-псіхалагічных і баявых якасцей, свядомага падпарадкавання камандзірам (начальнікам), падтрымання

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

**ВЫКАНАННЕ ВОІНСКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ ДЛЯ КОЖНАГА ВАЕННАСЛУЖАЧАГА АЗНАЧАЕ**

- верна і аддана служыць Рэспубліцы Беларусь, быць у пастаяннай гатоўнасці абараняць яе незалежнасць, тэрытарыяльную цэласнасць і канстытуцыйны лад
- выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і іншыя акты заканадаўства, Ваенную прысягу і агульнавоінскія статуты, выконваць загады камандзіраў (начальнікаў) безагаворачна, дакладна і ў тэрмін
- стойка пераносіць цяжкасці ваеннай службы, не шкадаваць свайго жыцця пры выкананні воінскага абавязку
- быць пільным, строга захоўваць дзяржаўную і службовую тайну
- пастаянна ўдасканальваць воінскае майстэрства, трымаць у гатоўнасці да прымянення дaвераныя яму ўзбраенне, ваенную і спецыяльную тэхніку, берагчы ваенную маёмасць
- быць сумленным і праўдзівым, даражыць гонарам і баявой славай абаронцы свайго народа, воінскім званнем і вайсковай таварыскасцю
- з годнасцю паводзіць сябе па-за межамі воінскай часці, не парушаць грамадскага парадку, не здзяйсняць непрыстойных учынкаў і ўтрымліваць іншых ад здзяйснення такіх учынкаў, спрыяць абароне гонару і годнасці грамадзян

Мал. 87. Выкананне воінскай дысцыпліны

ў воінскай часці (падраздзяленні) статутнага парадку, праяўлення паўсядзённай патрабавальнасці камандзіраў (начальнікаў) да падначаленых, павагі іх асабістай годнасці, пастаяннага клопату пра іх, умелага спалучэння і правільнага прымянення мер па перакананні і прымусе (мал. 87).

**Заахвочванні, якія прымяняюцца да ваеннаслужачых.** Заахвочванні з’яўляюцца важным сродкам умацавання воінскай дысцыпліны і правапарадку, стымулявання добрасумленнага выканання ваеннаслужачымі свайго воінскага абавязку.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выкананні воінскага абавязку, выдатныя вынікі ў баявой падрыхтоўцы, асваенні баявой тэхнікі і ўзбраення, узорнае кіраўніцтва падначаленымі падраздзяленнямі, воінскімі часцямі і злучэннямі, шматгадовае бездакорнае выкананне воінскага абавязку камандзіры (начальнікі) — ад камандзіра роты,

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки